ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 81 (1350) | ЧАЦЬВЕР, 9-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэл. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Прымусім мозг, машыны надаць рабоце поўны ход!


Трэці год пяцігодкі павінен даць 518 фабрык, заводаў і 1040 новых машынатрактарных станцый. У сваёй адозьве да ўсіх рабочых і колгасьнікаў СССР, рабочыя тульскага заводу № 1 падкрэсьліваюць, што гэтыя 518 новых прадпрыемстваў увойдуць у эксплёатацыю на працягу аднаго году, тады як за 4 мінулыя гады было пушчана толькі 323.

Гэтыя лічбы будуць выканаы ва ўмовах яшчэ большага разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва, уцягненьня ў работу ўсіх сіл для ліквідацыі адсталых вучасткаў, ва ўмовах, калі мы прымусім мозг машыны і рукі надаць рабоце поўны ход.

Паказваючы свае дасягненьні тульцы зьвярнуліся да рабочых Донбасу з рахункам.

Комсамольцы Менскай абутковай фабрыкі пачулі заклік тульцаў. Разам з рабочымі іншых прадпрыемстваў, яны ўступілі ў рашаючы бой за выкананьне грандыёзных задачы трэцяга году 5-ці годкі. Яны прад'яўляюць свой рахунак Віцебскаму скурзаводу. Рабочыя адных цэхаў і процэсаў прад'яўляюць свае рахункі рабочым папярэдніх процэсаў.

Неабходна каб да другой гадавіны соцспаборніцтва ўсе комсамольскія колектывы Беларусі, па прыкладу комсамольцаў абутковай фабрыкі ў адказ на ліст тульскіх рабочых, прад'явілі рапарты аб сваёй барацьбе за выкананьне пляну рашаючага году пяцігодкі, аб барацьбе за 518 і 1040.



Абвяшчаем вайну браку

Комсамольскі колектыў шорнай фабрыкі ўключыўся ў паход за якасьць.

Групай „лёгкай кавалерыі" быў праведзены налёт на паасобныя цэхі. Выяўлена, што кваліфікацыя новых рабочых на прадпрыемствах не пастаўлена як павінна быць. Гэта надзвычайна балюча адбіваецца на якасьці продукцыі і павялічвае процант браку.

Вельмі дрэнна адбіваецца на якасьці продукцыі няправільнасьць мадэляй і адсутнасьць патрэбных інструмантаў.

Усе гэтыя недахопы абгаварваліся на сходзе комсамольскай ячэйкі. Пасьля гэтага адміністрацыя фабрыкі, сумесна з усім рабочым колектывам, узялася за ліквідацыю браку.

Зараз брак амаль зьнішчан. Значна палепшылася якасьць продукцыі. Гэта—адказ на заклік тульскіх рабочых. Лепшая якасьць продукцыі стане аднэй з конкрэтных спраў па выкананьню пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі і лепшым рапартам да другой гадавіны соцспаборніцтва.

Пост „Ч. З". Бацьвінік

Комсамол, рабочая і колгасная моладзь!

У адказ тульскім рабочым рапартуйце фактамі і лічбамі вашай барацьбы за пляны 3 рашаючага, за 518 і 1040.

АБ ЧЫМ ГАВОРАЦЬ ТУЛЬЦЫ

Кожнае новае прадпрыемства і МТС 3-га году 5-годкі адзначым новым шматтысячным прылівам ва ўдарныя брыгады, уздымам соцспаборніцтва на вышэйшую ступень

Пляны рашаючага году выканаем!

Гэтымі днямі ў газэце „Праўда" быў зьмешчаны ліст рабочых Тульскага заводу № 1, прысьвечаны другой гадавіне соцспаборніцтва.

— Ці чулі вы аб тым, што сёлета мы павінны пусьціць у ход 518 новых фабрык і заводаў? Ці чулі вы аб тым, што сёлета мы адчыняем 1040 новых машынатрактарных станцый? — пытаюцца тульскія рабочыя.

Падумайце над гэтымі лічбамі нашых найвялікшых перамог,—кажуць яны далей. Значэньне гэтых лічбаў асабліва паказальна калі прыняць пад увагу, што за 4 гады (з 1927 па 1930 г.) мы пусьцілі новых 323 прадпрыемствы, а ў 1924 годзе ў нас была толькі адна машынатрактарная станцыя.

Ці ведаеце вы аб гэтым, пролетарыі працоўныя? Калі вы чулі аб гэтым, калі вы знаеце аб грандыёзнасьці задач, якія сёлета стаяць перад намі, дык што вамі зроблена, каб забясьпечыць посьпех 3-га году 5-годкі?

Рапартуючы аб сваіх посьпехах і дасягненьнях, яны пытаюцца:

— Як-жа, таварышы, пастаўлена справа ў вас?

— Ці выканалі вы програму першага кварталу?

— Колькі рабочых ў вас ахоплена соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам; колькі ў вас ударных брыгад; ці ўжываецца ў вас мэтод грамадзкага буксіру; ці ёсьць скразныя ўдарныя брыгады; як вы змагаецеся за якасьць продукцыі; ці прынялі вы захады да таго, каб ліквідаваць брак і іншыя недахопы ў якасьці, аб каторых тав. Сталін на 16-м зьезьдзе партыі гаварыў: „гэта ганебная пляма на нашым прадпрыемстве"?

Як вы выканалі заданьне па зьніжэньню собекошту, як шырока ў вас пастаўлена вынаходзтва і работа вытворчых нарад.

Мы прапануем

Давесьці да кожнага рабочага і колгасьніка лічбы нашых вялікіх дасягненьняў, каб кожны ведаў, што не дарма страчана столькі сіл і энэргіі.

Лічбы 518 і 1040 павінны ведаць і жонкі і дзеці рабочых, колгасьнікі і колгасьніцы, серадзнякі і беднякі—заўтрашнія колгасьнікі.

Мы прапануем

У гонар новых прадпрыемстваў і новых МТС абвясьціць набор ударнікаў імя 518 і 1040. Няхай у гонар кожнага новага прадпрыемства, да другой гадавіны соцспаборніцтва— вялікага сьвята ўсіх працоўных—Першае Мая,—вальлецца ў соцспаборніцтва новая тысяча ўдарнікаў. Хай у гонар кожнай новай машынатрактарнай станцыі зьявяцца новыя тысячы ўдарнікаў колгасьнікаў і колгасьніц


З асобым рахункам тульцы зьвяртаюцца да гарнякоў Донбасу.

Усе рабочыя чакалі,—пішуць яны,—што ў Донбасе будзе дасягнуты пералом у рабоце, але яго няма. За першы квартал ваша запазычанасьць краіне зноў вырасла на 2 мл. тон. Асабліва дрэнна справа з мэханізацыяй здабычы. Няўжо вас не заразіць геройчны прыклад другога атраду гарняцкай масы нафтавікаў Баку і Грознага? Мы бачым, як на справе выконваецца лёзунг „дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны"; па нафце мы абагналі ўсю Эўропу і адстаем толькі ад Амэрыкі.

Па чорнаму мэталю (чыгун) мы яшчэ ў 1928 годзе стаялі на 6 м месцы, у 1929 годзе мы абагналі Бэльгію і занялі яе месца, сёлета мы павінны абагнаць Ангельшчыну, якая займае 4-е месца ў сьвеце. Мы павінны вырваць у яе гэтае 4-е месца і адпіхнуць Ангельшчыну на 5 месца, а потым дагнаць Нямеччыну.

Уступаючы ў другі квартал бягучага году, тульцы зьвяртаюцца да ўсіх рабочых і работніц СССР, да ўсіх сельска-гаспадарчых рабочых і работніц, да ўсіх колгасьнікаў і колгасьніц:

У нас ёсьць магчымасьці выканаць плян 3-га рашаючага году 5-цігодкі. Дык пакажам жа, што мы можам выконваць гэтыя магчымасьці. Мобілізуючы ўсю нашу энэргію, усю нашу волю, сьцягнем усе нашыя рэзэрвы ўсёй шматмільённай масы і пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі і яе ЦК—выканаем і перавыканаем народнагаспадарчы плян 1931 году, завяршым пабудову фундаманту соцыялістычнай эканомікі СССР.



Комсамол Менскай абутковай адказвае на заклік рабочых „Першага тульскага"

Комсамольцы і беспартыйная рабочая моладзь Менскай абутковай фабрыкі, абгаварыўшы адозву рабочых першага тульскага заводу да ўсіх рабочых і сялян Савецкага юзу, заяўляюць:

Фронт якасьці на нашай фабрыцы прарваны. У першы квартале 3-га рашаючага году 5-ці годкі фабрыка дала 26 проц. браку, замест вызначаных сустрэчным промфінпляном 4 проц.

Пры тым становішчы, якое мы маем зараз, пры наяўнасьці вялікай колькасьці процэсаў вытворчасьці абутку, самы маленькі проц. браку па аднаму процэсу выклікае ў суме вялікі процант браку.

Мы прапануем, на падставе вопыту працы, які ў нас есьць, выпрацаваць для кожнага паасобнага процэсу процант браку, каб у суме ўсіх процэсаў вытворчасьці ён не перавысіў 4 проц

За гэта мы будзем змагацца.

Штодзённай ударнай працай, асабістым прыкладам зрушым крывую браку ніжэй 4 проц.

Вывучым машыну, на якой працуем, каб самім рабіць нязначны рамонт. Гэта пазбавіць фабрыку ад шматлікіх гадзін прастою з-за нязначных псаваньняў машыны.

Манцёр машыннага цэху фабрыкі т. Склучынскі ўзяў шэфства над 5 комсамольцамі што працуюць з ім на адной зьмене і абавязаўся перадаць усе свае веды гэтым комсамольцам, дапамагаючы ім авалодаць навейшай тэхнікай вытворчасьці.

Заклікаем усю рабочую моладзь і рабочых фабрыкі узяцца з бальшавіцкай энэргіяй на вывучэньне тэхнікі вытворчасьці, каб стаць кваліфікаванымі будаўнікамі 5-ці годкі.

Дрэнная праца на адным працэсе тармозіць працу цэлага цэху. Неабходна грамадзкае падцягваньне адстаючых Лепшыя ўдарнікі фабрыкі, патрабуйце сапраўды ударнай працы ад суседаў па варштату. Гэтага патрабуюць тэмпы нашай будоўлі.

Значна адбіваецца на якасьці нашай продукцыі якасьць поўфабрыкату, які дасылае нам Віцебскі скурзавод. Комсамольцы і ўсе рабочыя Віцебскага скурзаводу.

Выходзьце на барацьбу з бракам! Разгорнутым фронтам соц. спаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечце добрую якасьць поўфабрыкату.

Гэта—ваш пролетарскі абавязак.

Выходзьце з рапартамі перамог.

На заклік тульскіх пролетараў адкажам магутным уздымам ініцыятывы ўсіх рабочых ў барацьбе за выкананьне 5-ці годкі ў найкарацейшы час.

БАЯВЫ МАРШ МОЛАДЗІ ЛІБКНЭХТА


БЭРЛІН, 8. 7-га ўвечары ў цэнтры Бэрліна адбылася дэмонстрацыя прысьвечаная зьлёту рэволюцыйнай моладзі, якая была наладжана комуністычнай моладзьдзю. А сёмай гадзіне ўвечары на Розенталерплац выступіў перад сабранай рабочай рабочай моладзьдзю прадстаўнік комуністычнага Саюзу Моладзі.

Трое паліцэйскіх з рэвольвэрамі ў руках імкнуліся разагнаць сход, але гэта ім не ўдалося. Сход пераварыўся ў магутную дэмонстрацыю, настолькі магутную, што быў парушан гарадзкі. Мітынг быў праведзен таксама і ў іншым месцы. Мітынг прыпыніў рух аўтамабіляў, трамваяў і г. д.

Паліцыя адчыніла агонь па дэманстрантах і дала больш дваццаці выстралаў. Рабочая моладзь аказала супраціўленьне і закідала паліцыю бутэлькамі з возу, які недалёка стаяў. Некалькі паліцэйскіх ранена. Раней чым падасьпелі значныя паліцэйскія сілы, дэманстранты разышліся. Заключная дэманстрацыя ў сувязі са зьлётам рэволюцыйнай моладзі прайшла над знакам сапраўды баявых настрояў.

28-III, па распараджэньню начальніка бэрлінскай паліцыі—соцыялдэмократа Гржэзінскага, паліцыя зрабіла налёт на дом імя Карла Лібкнэхта, у якім знаходзіцца ЦК нямецкай компартыі і рэдакцыя „Ротэ-Фанэ“ і зрабіла там пільны обыск.

На здымку: Паліцыя пасьля обыску пакідае дом Карла Лібкнэхта.



Заклік да солідарнасьці

БЭРЛІН. У сувязі з барацьбою гарнякоў Францыі, міжнародны Камітэт рэволюцыйных гарнякоў зьвярнуўся з адозвай да рэволюцыйных горнарабочых ўсіх краін. Адозва падкрэсьлівае асабліва значэньне забастоўкі францускіх гарнякоў, адзначаючы, што адначасова ідзе наступленьне шахтаўласьнікаў на рабочых ва ўсіх іншых краінах.

Адозва ганьбіць рэформісцкі інтэрнацыянал гарнякоў, які ў асобе лідэраў профсаюзу францускіх гарнякоў выступае супроць бастуючых сумесна з паліцыяй і жандармамі і організуе штрэйкбрэхерства для зрыву забастоўкі, паўтараючы тактыку нямецкіх профбюрократаў у час рурскай забастоўкі. Адозва заклікае гарнякоў усіх краін дэмонстраваць сваю солідарнасьць з шахцёрамі Францыі, стварыць камітэты солідарнасьці і адкрыць збор сродак для аказаньня дапамогі бастуючым.

Усенароднае галасаваньне за роспуск Цюрынгенскага ландтагу

БЭРЛІН. Міністэрства ўнутраных спраў Цюрынгіі задаволіла патрабаваньне нямецкай компартыі па правядзеньню усенароднага галасаваньня па пытаньню аб роспуску Цюрынгенскага ландтагу.

Галярэя опортуністых

Яны зрываюць ільназагатоўкі і патураюць кулаку

6-га красавіка мы зьмяшчалі матар'ялы аб стане ільназагатовак. Мы патрабавалі ад комсамольскіх організацый, каб яны павялі рашучую барацьбу з тымі, хто займаецца жонглёрствам лічбамі, бо паасобныя раёны дасылаюць у Наркамснаб лічбы выкананьня пляну ільназагатовак, якія не адпавядаюць сапраўднасьці.

Сёньня мы зноў зварочваем увагу на факты жонглёрства лічбамі, выкрыўленьне клясавай лініі ў ільназагатоўках, права-опортуністычную практыку, боязьнь наступаць на кулака—заможніка.

Жыткавіцкі раён

На 15-е сакавіка, згодна зводкі, якую раён даслаў у Наркамснаб, выкананьне пляну ільназагатовак выражалася ў 31,4 проц. На 1-е красавіка Жыткавіцкі раён даслаў другую зводку, у якой гаворыцца, што плян ільназагатовак па раёне выканан толькі на 16,3 проц.

У чым справа? што гэта за сьвістапляска лічбамі?

Цьвёрдае заданьне кулакам дадзена толькі ў 9,2 проц. раённага пляну (трэба 12—15 проц.). Спагнана з кулакоў цьвёрдага заданьня па ільнавалакну 27 проц. і ільнанасеньню 22,9 проц.

Плян кантрактацыі лёну па колгасах і бядняцка-серадняцкіх гаспадарках выканан н 30 проц.

6-га красавіка „Чырвоная Зьмена“ запрасіла сэкратара райкому комсамолу, тав. Шылера, даць на старонках газэты тлумачэньне: чаму такі ганебны нізкі процант выкананьня пляну ільназагатовак, чым тлумачыцца тое, што кулак атрымаў нізкае заданьне на здачу ільнавалакна, чаму не спагнана з кулака цьвёрдае заданьне і якія ўжыты захады, каб выправіць дапушчаныя факты выкрыўленьня клясавай лініі ў ільназагатоўках? Сёньня мы дадаткова патрабуем ад Шылера даць адказ на раней пастаўленыя перад ім пытаньні і аб тым, чаму процант выкананьня ільназагатовак на 1-IV з 31,4 проц. зьнізіўся да 16,3 проц.

Адначасова зварочваем на гэта ўвагу сэкратара райкому партыі і старшыні райвыканкому і патрабуем высьветліць конкрэтных вінавайцаў ужыўшы захады для 100-га выкананьня пляну ільназагатовак і кантрактацыі.

Вульскі раён

На 15-III-г. г. у зводцы выкананьне пляну ільназагатовак стаяла 39.3 проц. а на 1-IV крывая па а ўніз да 22, проц. Кулацкім гаспадаркам дадзена заданьне ў 2.3 проц. раённага пляну (замест 12-15 проц) Спагнана ільнавалакна з кулакоў 72,1 проц. і ільнанасеньня 25 проц.

Плян кантрактацыі льну выканан толькі на 14 проц.

Просім сэкратара Вульскага райкому комсамолу тав. Цярэньцева даць на старонках газэты „Чырвонай Зьмены“ тлумачэньні: чаму гэта здарылася і якія ужыты захады для ліквідацыі гэтага прарыву?

Зараз пакажам раёны, якія застыглі на мёртвым пункце ў выкананьні пляну ільназагатовак.

Бабруйскі раён

На 15-е сакавіка г. г. выканаў плян ільназагатовак на 27,1 проц., а на 1-IV—28,1 проц. Кулакоў абклалі на 8,4 проц. раённага пляну, спагнана з кулацкіх гаспадарак 31,1 проц. цьвёрдага заданьня ільнавалакна і 45,2 проц. ільнанасеньня.

Плян кантрактацыі выканан на 7 проц.

Камарынскі раён

На 15 сакавіка плян ільназагатовак выканан на 28,4 проц., з 1-4—30 проц. Кулакоў выяўлі 3,8 проц. (замест 5,7 проц.) і нічога не спагналі з кулацка-заможных гаспадарак.

Плян кантрактацыі выканан на 25 проц.

Капаткевіцкі раён

На 15-III г.г. плян ільназагатовак быў выканан на 15,1 проц., а на 1-IV—15,7 проц. (узрост толькі на 0,6 проц.). Выяўлена кулакоў для індывідуальнага абкладаньня 5,2 проц., якія абкладзены на 3,7 проц. раённага пляну. Спагнана з кулакоў ільнавалакна 39 проц. і ільнанасеньня 47 проц.

Плян кантрактацыі выканан на 5 проц.

Уваравіцкі раён

На 15-III г. г. плян выканан на 34,5 проц. на 1-IV г.г. процант выкананьня ўзьняўся толькі да 35, 2. Выяўлена кулакоў для абкладаньня цьвёрдым заданьнем 2,4 проц. (замест 5,7 проц.), цьвёрдага заданьня па ільнавалакну спагнана на 48,8 проц.) і ільнанасеньню на 50,2 проц.

Плян кантрактацыі выканан на 5 пр.

Мы патрабуем у трохдзённы тэрмін ад сэкратароў: Вульскага РК КСМ—тав. Цярэньцева, Бабруйскага—тав. Райхельсона, Камарынскага—Райхмана, Капаткевіцкага—Шэнкмана і Уваравіцкага—тав. Краўца даць адказ: Чаму загатоўкі ў іх раёнах застылі на мёртвым пункце, чаму кулакі недаабкладзены і чаму непакараны кулакі-сабатажнікі? Што робіць комсамольская організацыя конкрэтна, каб ліквідаваць гэтыя прарывы?

На кожны ўдар пасьледуе контрудар.

НАПЯРЭДАДНІ ШОСТАГА АГУЛЬНА-НЯМЕЦКАГА ДНЯ МОЛАДЗІ

(ад нашага спэцкора)

Шосты агульна-нямецкі дзень моладзі павінен быў упачатку адбыцца ў Бэрліне. Соцыял-фашыцкія прэзыдэнты Нямеччыны не забылі яшчэ леташняй дэмонстрацыі 100 тыс. комсамольцаў у Лейпцыгу! Вось чаму і пасьпяшыў паліцэй-прэзыдэнт Бэрліна соцыял-фашысты Гржэзінскі, забараніць усе дэмонстрацыі комсамолу ў дні „сьвятога вялікадню“—бо гэта будзе зьвязана з „крыўдай пачуцьцяў веруючых“!..

А соцыял-фашыстыя з „Форвэртса“ сьцьвярджалі, што гэта яшчэ не фашызм.

Комсамольцы былі іншай думкі. Яны высунулі

„сустрэчны“

І рашылі наладзіць сьвяткаваньне дня моладзі ў чатырох мясцох: у Бэрліне—дзе царуе соцыял-фашысты Гржэзінскі,

у Франкфурце на Майне—дзе царуе другі соцыял-фашысты, Штэйнбэрг,

у Іене, дзе роўна 15 год назад, 1-га красавіка 1916 году, у часе разгулу соцыял-імпэрыялізму і шовінізму, заседаў зьезд рэволюцыйнай моладзі Карла Лібкнэхта, і дзе цяпер верхаводзіць фашысты Фрык,

у Браўншвэйгу, дзе верхаводзіць фашысты—Францэн.

Такі быў комсамольскі „сустрэчны“—павялічэньне на 400 проц.

Гэты факт ня даў спаць усім фашысцкім „царкам“. Дзякуй Брунінгу—ён дапамог сваім лёкаям.

48 гадзін пасьля таго як рэйхстаг, галасамі ўсіх партый, за выключэнне комуністых, „вызваліў“ сябе на 6 месяцаў ад усякай работы, нават ад работы пабалбатаць,—Брунінг выдаў новую абавязковую пастанову на падставе § 48—адзінага функцыянуючага § нямецкай „дэмократыі“. Гэтым распараджэньнем аказваецца „такія-жа і такія-та“ §§ нямецкай конституцыі і адзіным „дзейным“ [illegible] ...

паліцэйская гумовая дубінка! Адмяняецца свабода сходаў, уводзіцца цэнзура нават на плякаты, дазваляецца адміністрацыйным парадкам забараняць усе газэты да паўгода, забараняецца нашэньне уніформ і значкоў, забараняецца... забараняецца... забараняецца...

Партыя, комсамол, рэволюцыйная профопозыцыя, пролетарскія організацыі абвясьцілі контр-наступленьне пад лёзунгам:

„Наш адказ Брунінгу“

і мобілізаваліся.

Паліцэйская машына запрацавала...

Дакумант № 1

> ПОЛІЦЭЙПРЭЗЫДЭНТ.
>
> *Бэрлін, 31 сакавіка 1931 году.*
>
> *Цэнтральнаму Камітэту*
> *Комсамолу Нямеччыны*
>
> *БЭРЛІН Ц 25.*
>
> *Мал. Аляксандраўская, 28.*
>
> *Гэтым забараняю на падставе § 1, 1-4 разьдзелу абавязковай пастановы пана прэзыдэнта дзяржавы ад 28 сакавіка 1931 году ўсе абвешчаныя сходы і мітынгі комсамолу ад 3-IV—31 г. да 7-IV—31 г.*
>
> *Подпіс: ГРЖЭЗІНСКІ.*

Коратка і... як быццам ясна.

І гэта называецца—вы думаеце, фашызмам?—не, гэта „д-д-д-эмократыя“!

Зайздрасьць—дрэнны сябра. Лаўры Гржэзінскага ня далі спаць яго партыйнаму „Геноссэ“ Штэйнбэргу ў Франкфурце. За дакумантам № 1 пасьледваў.

Дакумант № 2

> *„На вялікі жаль (!!! А. П.) я ня маю магчымасьці даць дазвол на дэмонстрацыю ў сувязі з мяркуемым на вялікдзень Паўднёва-Нямецкім днём моладзі ў Франкфурце. Выключэньні з існуючай агульнай забароны дэмонстрацый ня могуць быць зроблены“.*
>
> *Подпіс: ШТЭЙНБЭРГ.*

„Бедны“ Штэйнбэрг! І „на жаль“ нават уляпіў. Ужо занадта набраліся сораму соцыял-фашысты нават перад афіцыйнымі фашыстымі, перад міністрамі Фрыкам і Францэнам, якія пакуль яшчэ не забаранілі дэмонстрацыі!

Комсамол праводзіць цяпер свой „штурмавы плян“. На 5 красавіка павінна быць праведзена палова намечанага пляну. Ва многіх кунктах палова пляну ўжо перавыканана. Кэнтроль пакажа моцныя і слабыя бакі ў правядзеньні пляну.

А сёньня ўжо ясна: фашызм і соцыял-фашызм у сваёй барацьбе з комсамолам натыкнуцца на [illegible] і яшчэ паламаюць себе на гэтым зубы, [illegible].

Партыя паставіла перад комсамолам [illegible] задачу:

Ліквідаваць саюз „Соцыялістычнай рабочай моладзі“

(вярней соцыял-фашысцкі саюз моладзі)

Сотні пролетарскіх членаў соцыял-фашысцкіх, нацыяналістычных і розных рэлігійных організацый пераходзяць у комсамол. У сувязі з агульна-нямецкім зьездам комсамолу 5 і 6 красавіка ў Бэрліне, адбываюцца ва ўсёй Нямеччыне акруговыя зьезды комсамолу (у Лейпцыгу—Саксонскі зьезд, у Кенігсбэргу—Усходня-Прускі і г. д.). На ўсіх зьездах прысутнічалі дзесяткі беспартыйных, опозыцыйных членаў соцыял-фашысцкіх організацый моладзі, якія выказалі сваю гатоўнасьць змагацца ў першых радох комсамолу супроць фашызму. Такім чынам

комсамол ідзе сьмела па шляху заваяваньня большасьці рабочай моладзі Нямеччыны

У яго пераможным руху ўперад ня змогуць яго затрымаць ні соцыял-дэмократычная „дэмократыя“, ні гумовыя дубцы соцыял-фашысцкай паліцыі, ні наймовыя забойцы Гітлера. На месца аднаго забітага таварыша становяцца дзесяткі, сотні новых. На кожны ўдар пасьледуе контр-удар.

5 і 6 красавіка будуць поўным экзаменам для нямецкага комсамолу. На парадку дня стаіць у самай вострай форме пытаньне:

Хто каго?

Для нас няма сумненьняў.

„З намі масы—з намі перамога“!

Лейпцыг, 1 красавіка 1931 г.

Зараз-жа навярстайце ўпушчанае

СЛУЦАК.—5, Слуцкі РК ЛКСМБ недаацаніў важнасьці правядзеньня ўсебеларускага рэйду „лёгкай кавалерыі“ па праверцы падрыхтаванасьці раённых устаноў і колгасаў да 2-ой бальшавіцкай вясны. Рэйд правалены.

Намесьнік сэкратара РК ЛКСМБ гаворыць: „Гэтая праверка ўжо завязла на зубах. Правярай, ды правярай“.

Такія адносіны да падрыхтоўкі зьяўляюцца шкоднымі праваопортуністычнымі. Неабходна зараз-жа навярстаць упушчанае, „Лёгкая кавалерыя“ павінна праверыць, як раённыя ўстановы і колгасы рыхтуюцца да вясеньняй пасеўнай кампаніі і організацыі прыліву ў колгасы

Юдзянкоў

10-IV—пачатак ліквідацыі 6-ці м-ка політняпісьменнасьці вясковага комсамолу

У ТЭРМІН АУЛАДАЦЬ ВЫШЫНЯМІ ПОЛІТМІНІМУМУ

„ЧЫРВОНАЗЬМЕНАУСКІ“ АГЛЯД ПОЛІТВУЧОБЫ У ЛЁЗЬНЕ ПЕРАТВАРЫЦЬ ВА УСЕБЕЛАРУСКІ

ПА-ЎДАРНАМУ ПРАВЕСЬЦІ МОБІЛІЗАЦЫЮ „ТЫСЯЧЫ“. РЫХТАВАЦЦА ДА ЎСЕСАЮЗНАГА ДВУХДЭКАДНІКА

Зьліквідаваць прарыў у комсамольскай політсецы

(З пастановы Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б аб становішчы політвучобы ў ЛКСМБ).

Заслухаўшы даклад ЦК ЛКСМБ аб політвучобе ў комсамоле, Сэкратарыят ЦК констатуе, што становішча політвучобы ў большасьці раёнаў нездавальняючае (усяго ахоплена комсамольцаў рознымі формамі політвучобы 30—35 проц.) што зьяўляецца вынікам опортуністычнай недаацэнкі значэньня політвучобы ў комсамоле з боку часткі РБ, колектываў ячэек, няўменьне ўвязаць паварот комсамольскай організацыі тварам да выкананьня гаспадарча-політычных задач з шырокім разгортваньнем політвучобы, зусім слабое кіраўніцтва сыстэмай комсамольскай політвучобы з боку ЦК ЛКСМБ і РК КП(б)Б, недастатковая падрыхтаванасьць пропкадраў незабясьпечанасьць політсеткі падручнікамі на белмове і нацмовах.

Прапанаваць ЦК ЛКСМБ, РК КП(б)Б і ячэйкам прыняць самыя рашучыя захады для ліквідацыі прарыву ў комсамольскай політ-сетцы, забясьпечыўшы 100 проц. ахоп комсамольцаў і рабочай моладзі рознымі формамі комсамольскай політвучобы і партсеткай, прыняўшы тэрміновыя крокі да поўнага і своечасовага выкананьня пастаноў 9-га зьезду УсеЛКСМ аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу на працягу 6-ці месяцаў, поўнасьцю прыстасаваўшы політвучобу да спэцыялізацыі раёну, уключыўшы пытаньне тэхнікі ў програмы політвучобы.

* Сэкратарыят ЦК КП(б)Б прапануе РК і ячэйкам КП(б)Б сыстэматычна правяраць ход політвучобы ў комсамоле і абавязвае організаваць і палепшыць мэтодычнае кіраўніцтва усёй комсамольскай політсеткай. Разам з гэтым, ускласьці адказнасьць на партгабінэты пры РК КП(б)Б за сталае мэтодычнае кіраўніцтва комсамольскай політвучобай у раёне.

* Адобрыць пастанову ЦК ЛКСМБ аб паходзе комсамолу за рэволюцыйную тэорыю, прапанаваць РК і ячэйкам КП(б)Б правесьці масавы агляд політвучобы. На Бюро РК заслухаць даклады РК ЛКСМ аб становішчы політвучобы і аб выкананьні кантрольных лічбаў па распаўсюджваньню шасьцітомніка Леніна.

* Абавязаць ЦК ЛКСМБ і РК КП(б)Б карэнным чынам палепшыць склад комсамольскіх пропагандыстых, максымальна павялічыўшы высоўваньне рабочых на пропагандысцкую працу і організаваўшы для іх кароткатэрміновыя курсы. Адначасова прапанаваць ЦК ЛКСМБ, сумесна з культпропам ЦК КП(б)Б, праверыць склад райпропагандыстых, асабліва прымежных раёнаў, прыняўшы адпаведныя захады для яго палепшаньня.

* Адзначаючы зусім нездавальняючую пастаноўку вучобы комсамольскага актыву, прапанаваць ЦК ЛКСМБ і РК КП(б)Б прыняць адпаведныя захады, каб поўнасьцю ахапіць комсамольскі актыў рознымі формамі комсамольскай політвучобы і партсеткаю, значна пашырыўшы тэматычныя прадметныя гурткі, павялічыць ахоп комсамольцаў партсеткай, максымальна ахапіць комсамольскі актыў рознымі завочнымі формамі політвучобы, скарыстоўваючы радыё для падрыхтоўкі актыву.

БЕЗАДКЛАДНА ПРЫСТУПІЦЬ ДА ВЫКАНАНЬНЯ

Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб выкананьні рашэньня 9-га зьезду аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковых комсамольцаў

Абавязаць усе організацыі прыступіць з 15 красавіка да выкананьня рашэньняў зьезду аб ліквідацыі політ-няпісьменнасьці комсамольцаў вёскі. Выходзячы з гэтага, даручыць крайкомам, абкомам, ЦК нацрэспублік і, пад іх кіраўніцтвам, усім РК і ячэйкам УсеЛКСМ абгаварыць данае пытаньне, а таксама гэтае рашэньне ЦК, і вызначыць конкрэтныя мерапрыемствы з тым, каб ажыцьцявіць рашэньні зьезду аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковых комсамольцаў.

Рэорганізаваць існуючую сетку політадукацыі на вёсцы на аснове ўвядзеньня залiковай прапрацоўкі і ўсваеньня кожным вясковым комсамольцам абавязковага політмінімуму.

Увесьці наступны абавязковы політмінімум для паасобных груп вясковых комсамольцаў:

Для вясковых комсамольцаў—політычна няпісьменных, агульнаадукацыйна малапісьменных:

„Аб партыі Леніна“ (асновы будаўніцтва партыі, політыка партыі на вёсцы).

„Аб клясавай барацьбе“;

„Што такое савецкая ўлада“ (асновы констытуцыі і задачы саветаў на вёсцы).

„Аб чарговых задачах комсамолу“.

Для політычна малапісьменных комсамольцаў, якія праходзяць вучобу ў гуртках бягучай політыкі і політцыткаў па выпусках політцыткаў:

„Політыка партыі на вёсцы“

„Мы ўступілі ў пэрыод соцыялізму“.

„УсеКП(б)—партыя рабочае клясы“.

Даручыць ОПТУ ЦК і выдавецтву „Маладая гвардыя“ у месячны тэрмін выпусьціць гэтыя брошуры, агульным аб'емам у 6 друк. стар. Даручыць ОПТУ ЦК скласьці рэкомэндацыйны сьпіс літаратуры па першых крыніцах Леніна і Сталіна ў дадатак да гэтых тэм.

Даручыць сэкратарыяту прагледзець якасьць літаратуры.

Лічыць, што прапрацоўка гэтых тэм зьяўляецца абавязковай.

Тэрмін прапрацоўкі вызначыць 6 месяцаў.

Уся прапрацоўка гэтых тэм, павінна праводзіцца на аснове соцыялістычнага спаборніцтва між паасобнымі ячэйкамі, раёнамі, абласнымі, краёвымі організацыямі.

Абласным і краёвым камітэтам комсамолу організаваць строгі контроль і праверку ходу выкананьня прапрацоўкі політмінімуму. Пасьля прапрацоўкі гэтага мінімуму і праверкі якасьці ўсваеньня спэцыяльна складзенымі камісіямі кожнаму комсамольцу павінна ўклейвацца ў членскі білет УсеЛКСМ спэцыяльная марка, якая павінна пацьвердзіць усваеньне гэтым комсамольцам абавязковага політмінімуму.

Прапанаваць абкомам, райкомам, ЦК нацрэспублік забясьпечыць якасна-высокую прапрацоўку політмінімуму. Асноўнай задачай гэтай прапрацоўкі павінна зьявіцца павышэньне політпадрыхтоўкі, яшчэ большая мобілізацыя мас комсамольцаў на барацьбу за генэральную лінію партыі, за практычнае ажыцьцяўленьне соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Прапанаваць усім організацыям для правядзеньня данай работы мобілізаваць усіх політычнапісьменных комсамольцаў сваёй організацыі.

Абавязаць усе комсамольскія газэты організаваць сыстэматычны контроль і праверку ходу разгортваньня і прапрацоўкі політмінімуму. Абавязаць рэдакцыі газэт „Смена“ (орган Ленабкому) і „Комсомолец Украіны“ (орган ЦК ЛКСМУ) організаваць завочныя консультацыі па тэмах політмінімуму.

Вылучыць ва ўсіх ячэйках організатараў політвучобы з ліку найбольш політычна разьвітых комсамольцаў, членаў бюро ячэек, у абавязак якіх войдзе організацыя політвучобы у ячэйках, ажыцьцяўленьне штодзённага контролю за прапрацоўкай політмінімуму.

Правесьці перакідку сіламі ЦК 200 лепшых гарадзкіх пропагандыстых для работы на вёсцы.

Абавязаць мясцовыя організацыі дадаткова, у парадку ўнутранай мобілізацыі, перакінуць адну тысячу пропагандыстых з прамысловых цэнтраў для работы на вёсцы.

Тэрмін правядзеньня мобілізацыі—1 месяц.

Абавязаць усе гарадзкія ячэйкі УсеЛКСМ у парадку шэфства організаваць спэцыяльную пасылку брыгад пропагандыстых і паасобных актывістых на дапамогу вясковым ячэйкам для пропагандысцкай работы.

Організаваць з 15-га красавіка ўсесаюзны двухдэкаднік збору грашовых сродкаў і літаратуры для дапамогі ў разгортваньні політасьветы вясковых комсамольцаў.

З мэтай устанавіць сталы контроль за выкананьнем данага рашэньня на 6-цімесячны тэрмін, пачынаючы з 10 красавіка, ускласьці пэрсанальную адказнасьць перад ЦК за ліквідацыю політняпісьменнасьці вясковых комсамольцаў на таварышоў:

Іванова, (Маскоўскі абком), Вайшля (Ленінградзкі абком), Гапеева (ЦК ЛКСМУ), Герасімава (Іванаўск-прамысловы абком), Панова (Ніжагародзкі абком), Стукалава (Н. Волга), Забеліна (Зах. Сібір), Падгорнага (Паўн. Каў. крайком), Леонава (Усх. Сібір), Кушакоўскага (Ср. Волга) Шапа (Уралабком), Борзая (Казакстан). Рудых (абком ЦЧО). Грыгор'ява (Закрайком), Татарнікаву (Ср. Азія), і Гуткіна (ЦК ЛКСМБ).

У астатніх абкомах, крайкомах, ЦК нацрэспублік, пэрсанальную адказнасьць за правядзеньне ўскласьці на заг. ОПТУ.

Абавязаць крайкомы, абкомы, ЦК нацрэспублік, пачынаючы з 15-га мая, штомесячна інформаваць ЦК аб ходзе ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковых комсамольцаў.



На політзанятку

Узяліся за работу

Зембінская комсамольская ячэйка, Плешчаніцкага раёну, па-бальшавіцку ўзялася за прапрацоўку і ажыцьцяўленьне рашэньняў апошніх комсамольскіх зьездаў.

У сельсавеце організаваны 5 гурткоў па ліквідацыі політняпісьменнасьці, а таксама гурткі для політычна-малапісьменных. У канцы красавіка адбудзецца політбой паміж гурткамі.

ВІШНЯВЕР.

Праводзім прамполітбой

Ячэйка заводу „Чырвоны Харчавік“ (Бабруйскага раёну) па-ўдарнаму рыхтуецца да правядзеньня прамполітбою па пытаньнях прапрацоўкі і выкананьня рашэньняў 10-га зьезду ЛКСМБ і 9-га УсеЛКСМ. На комсамольскіх гуртках скончана прапрацоўка дакладаў т. т. Косарава і Салтанава. Усе комсамольцы ахоплены ўдарнымі брыгадамі.

Вялікае дасягненьне мае ячэйка і ў выкананьні лёзунгу аб 100 пр. ахопе рабочай моладзі комсамолам. 80 проц. рабочай моладзі—у комсамоле.

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да прамполітбою прымаюць піонэры. Імі выпушчана насьценная газэта, вывешаны лёзунгі.

Ячэйка разам з піонэр-атрадам узяла шэфства над рабочымі прапановамі.

Фэльдман.

Прыклад узорнай работы

Па распрацоўцы рашэньняў 9-га і 10-га зьездаў комсамолу паказвае комсамольская ячэйка камуны выхаванцаў імя Калініна.

Політшколу, якую наведваюць усе комсамольцы і 50 чалавек беспартыйнай моладзі.

Акрамя гэтага, ячэйка організавала 2 групы па політадукацыі, дзе займаюцца політычна няпісьменныя комунары.

Нябосеў.

Там, дзе зрываецца політвучоба

* Політвучоба ў комсамольскай організацыі Лёзьненскага раёну праваліна. Комсамольскія політгурткі і політшколы, якія існавалі пры колгасах і сельсаветах, перасталі працаваць. Завочным навучаньнем ніводзін комсамолец не ахоплен. У раёне маецца радыё-вузел, але РК ЛКСМБ ня змог яго скарыстаць для організацыі завочнага навучаньня.

СТАЛЁВЫ

* Політвучоба ў Вузьдзенскім раёне знаходзіцца пад пагрозай. Політгурткі ў шэрагу ячэек зусім не працуюць. Большасьць ячэек раёну не распачала прапрацоўкі рашэньняў IX і X зьезду комсамолу.

Бюро РК ЛКСМБ за апошнія 3 месяцы ні разу не заслухала справаздачу ячэек аб становішчы ў іх політвучобы. Бюро РК ня прыняла ніякіх захадаў, каб узмацніць у організацыі падпіску на „Чырвоную Зьмену“ і „Комсомольскую Правду“. ГУРТКОВЕЦ.

* У Смалявіцкім сельсавеце, Смалявіцкага раёну, ёсьць 2 ячэйкі і адна цэх'ячэйка пры ШКМ.

За ўвесь зімовы пэрыод пры ячэйках не організаваны політгурткі. Ячэйкі да гэтага часу нераспрацавалі рашэньняў X зьезду ЛКСМБ і IX зьезду ЎсеЛКСМ. Бюро РК ЛКСМБ ня прымае ніякіх захадаў у адносінах бюро ячэек, якія ігноруюць політасьвету.

П. ЛЕТНІ.

* Політвучоба комсамольскай організацыі Петрыкаўскага раёну ў заняпадзе. За апошні час наглядаецца сыстэматычнае ненаведваньне політшкол. Адпушчаныя сродкі для політгурткоў і школ не скарыстоўваюцца па прызначэньню. Усяму гэтаму садзейнічае Петрыкаўскі РК ЛКСМБ, бо нядбайна адносіцца да політвучобы.

П.

* Комсамольская ячэйка колгасу „Перадавік“, Чэрвеньскага раёну, налічвае ў сваіх шэрагах 9 політычна-няпісьменных комсамольцаў. Ня гледзячы на гэта, пры ячэйцы няма ніякіх гурткоў. У ячэйку нядаўна прыбыў комсамолец настаўнік Нікапчык, але ён нічога ня робіць, каб павысіць політычны ўзровень комсамольцаў.

А-к

* Політвучоба ня стала ў цэнтры ўвагі бюро комсамольскага колектыву Дамановіцкай ШКМ, які ахоплівае 160 комсамольцаў.

На цэхавых ячэйках яшчэ не распрацоўваліся рашэньні комсамольскіх зьездаў. Сэкратар колектыву і бюро ячэйкі тлумачаць зрыў політвучобы тым, што няма кіраўнікоў.

Партыйныя ячэйкі на мясцох не аказваюць ніякай дапамогі комсамольскім ячэйкам у політвучобе.

Пралеска

* Комсамольская ячэйка Барысаўскага дзённага рабфаку не аддае ніякай увагі ліквідацыі політ-няпісьменнасьці комсамольцаў і студэнцтва. Гурткі па распрацоўцы бягучай політыкі не організаваны.

Падпіска на юнацкі друк пастаўлена з рук вон дрэнна. РАМОК

Сёньня грамадзкі прагляд першай пастаноўкі ТРАМ'у

„ФРОНТЫ“

Увага плюс крытыка— нашы аплёдысмэнты

ЯўТРАМ адчыніў заслону. Ён нам паказаў сваю пастаноўку „Фронты“. Тэмпы рашаюць усё. ЯўТРАМ паказаў тэмпы. У працягу некалькіх месяцаў ён падрыхтаваў сваю першую пастаноўку. Комсамолец—ТРАМ'авец перанёс тэмпы пры выкананьні вытворчага пляну ў цэх мастацтва—у ТРАМ.

„Фронты“ ТРАМ'аўская справаздача. Як толькі ЯўТРАМ адчыніў заслону, мы адчулі, што маем справу з бурнай падзеяй у галіне комсамольска работы і творчасьці. І ня толькі комсамольскай.

ЯўТРАМ такое вялікае дасягненьне ў галіне пралетарскага фронту мастацтва у галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі што мала зьвярнуць на яго толькі адну ўвагу.

Патрабаваньня ўтварыць адпаведную фінансавую базу, кіраўніцтва і спрыяючы ўмовы для работы ТРАМ'аў (мы гэтага патрабавалі да першай пастаноўкі ЯўТРАМ'у і будзем гэта яшчэ больш настойліва патрабаваць пасьля пастаноўкі)—таксама яшчэ мала.

Патрабуецца крытыка, крытыка і яшчэ раз крытыка—здаровая крытыка, комсамольская, пролетарская! У крытыцы наш ЯўТРАМ будзе расьці. І мы хочам, комсамол хоча, каб тэмпы росту ЯўТРАМ (і ТРАМ'аўскага руху цалкам) былі-б пропорцыянальны тэмпам нашага агульнага росту.

ЯўТРАМ—на сцэне, наш ЯўТРАМ! Увага плюс крытыка—нашы аплёдысмэнты.

На правільным шляху, —але без памылак

„ТРАМ“—мастацкі агітпроп комсамолу.—Гэта добра сказана. Комсамол зьяўляецца бліжэйшым памочнікам бальшавіцкай партыі. і мастацкі агітаваць і пропагандаваць за комсамол—гэта значыцца драцца за генэральную лінію партыі, драцца за соцыялізм.

ТРАМ—гэта заклік ударніка і комсамольца ў тэатр. Комсамолец-ударнік прыходзіць са сваім энтузіязмам і творчымі здольнасьцямі на сцэну і ставіць яе (сцэну) па службу пяцігодцы.

ТРАМ—гэта мастацкі грамадзкі буксір. Мастацкімі сродкамі ён заклікан узяць на буксір усё адстаючае, будзіць у будаўнікоў радасьць соцыялістычнай творчасьці, радасьць комуністычных адносін да працы.

Наш ЯўТРАМ стаіць на гэтым шляху. На правільным шляху. Але ў сваёй першай пастаноўцы „Фронты“ дапушчаны шэраг памылак і недахопаў.

Гэроізм фронту і— гэроізм вытворчасьці

„Фронты“ намера паказаць у сьвятле „Трыпольскай трагэдыі“ гэроізм і энтузіязм комсамолу ў грамадзянскай вайне—учора; і ў сьвятле сучаснага Донбасу гэроізм і энтузіязм комсамолу ў цэху, у соцыялістычным будаўніцтве—сёньня.

Гэроізм фронту Фастоўскіх ператвараецца ў гэроізм вытворчы, трохмільённай комсамольскай ударнай брыгады, ня толькі „Трыпольле“, але і „Донбас“, ня толькі грамадзянскае, але і „мірнае“ соцыялістычнае будаўніцтва—зьяўляюцца фронтамі. Гэта асноўная ідэя пастаноўкі. Добрая ідэя.

Але вялікім недахопам у пастаноўцы ЯўТРАМ'у зьяўляецца тое, што „Трыпольле“ займае куды большае месца ў яе, чым „Донбас“. Ня толькі колькасна, але і якасна. Замест фронтаў атрымліваецца фронт. Замест паказу комсамольскага энтузіязму і радасьці будаўніцтва, галоўным чынам у сваёй аснове і ўдзел у сапраўдныя 5-годкі,—мы маем паказ самаадданасьці, гэроізму, адданасьці і радасьці, галоўным чынам у барацьбе супроць „бацькоўай зялёных“ мінулых дзён.

„Трыпольле“ дамінуе ў пастаноўцы над „Донбасам“. Гэта неабвяржальна. І гэта ў лепшым выпадку—лінія найменшага супраціўленьня. Сёньня, калі мы ўступілі ў пэрыод соцыялізму, калі мы маем соцыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, калі рабочыя нафты і рабочыя электразаводу выконваюць пяцігадовы плян у 2 з пал. гады,—на пярэдні пляне мы павінны даць рамантыку энтузіязму будаўніцтва,—рамантыку барацьбы супроць „Зялёнага“. Зразумела, што другое ня выключае першае. Але яно не павінна быць дамінуючым.

Мы ня супроць „Трыпольля“! Але пасьля 9 комсамольскага—дайце тое, што больш характэрна, што больш мобілізуе—дайце „Донбас“! Мы ня супроць гэроізму фронту (ко самол ... яшчэ прыйдзецца сучасны энтузіязм прамфінпляну пэратварыць у энтузіязм вінтоўкі)! Але пасьля 9 комсамольскага дайце тое, што больш характэрна, што больш мобілізуе—дайце гэроізм вытворчы!

„Фронты“ і— 9-ты комсамольскі

Фастоўскі ў 3-м акце ўжо далёка ад „Трыпольля“. Фастоўскі ў 3-м акце —на фронце соц. будаўніцтва, на Донбасе.

Як у 19-м годзе—мобілізацыя супроць „бацькі Зялёнага“, такі ў 30-м —мобілізацыя комсамольцаў на дапамогу ўсесаюзнай качагарцы.

Комсамол—на фронце ліквідацыі прарыву. Комсамол—у барацьбе з катастрофай у шахце. Комсамолец падае ў гэтай барацьбе. Комсамол перамагае—шахта выратавана Абіраюць дэлегатаў на 9-ы ўсесаюзны. Шлюць падарунак 9-му комсамольскаму—вагон з вугалем—выпрацаваны звыш нормы.

„Донбас“ (3-ці акт) у пастаноўцы ЯўТРАМ'у, як сказана,—ня ў цэнтры. Ён вібы ізоляваны ад першых частак Толькі мэханічна зьвязаны.

І з ўсяго гэтага ўжо вынікае самы галоўны недахоп—мы яшчэ ня маем у трэцім акце таго комсамолу, які мы павінны былі бачыць пасьля 9-га комсамольскага!

Мастацкі кіраўнік—тав. Олендэр

9-ты комсамольскі падкрэсьліў паварот комсамолу тварам да гаспадарчага будаўніцтва, вялікую ролю комсамолу ў барацьбе за пяцігодку, у барацьбе за колектывізацыю, в лікую ролю комсамолу, як ліквідатара паасобных прарываў на розных фронтах нашага будаўніцтва. гістарычную ролю комсамолу ў барацьбе за комуністычныя адносіны да працы.

Было-б сьмешна патрабаваць, каб ТРАМ'аўская пастаноўка была перарасказам дакладу тав. Косарава. Але ад пастаноўкі, якая прэтэндуе, як „Фронты“, паказаць комсамол на фронтах нашага грандыёзнага будаўніцтва, можна патрабаваць даць ярка концэнтраваную мастацкую ілюстрацыю да важнейшых тэзісаў Косарава! „Фронты“ гэтага яшчэ не паказваюць. „Фронты“ адстаюць ад тэй ступені. якую дасягнуў усесаюзны комсамол у пэрыод і пасьля 9-га, комсамольскага. І гэта зьяўляецца асноўнай памылкай пастаноўкі.

„Фронты“ дыхаюць комсамолам. Але дрэнна тое, што ў пастаноўцы недастаткова ярка паказана кіраўнічая роля партыі. Комсамольскі энтузіязм можа быць толькі пры партыкіраўніцтве. У „Фронтах“ гэта павінна прайсьці чырвонаю ніткай.

Вялікае дасягненьне

Адзначаныя памылкі ў пастаноўцы могуць быць спраўлены. І мы ўпэўнены што яны будуць выпраўлены. „Фронты“ ад гэтага толькі выйграюць. ЯўТРАМ паказаў тэмпы. Але тэмпы плюс якасьць вырашаюць усё.

„Фронты“ паказваюць неперарыўнасьць барацьбы клясавай барацьбы. Ня толькі грамадзянская вайна, ня толькі „Трыпольле“, але і соцыялістычная рэконструкцыя, „Донбас“ зьяўляюцца пэрыодамі абвостранай клясавай барацьбы. Гэта мы бачым у „Фронтах“. І гэта вялікае дасягненьне.

Можна было-б спрачацца ці варта ўзяць іменна гэты разьдзел грамадзянскае вайны, які зьвязаны з паражэньнем. Можна было-б сказаць, што куды больш правільна было-б паказаць гэроізм і энтузіязм які вядзе да перамогі, чымся самаадданасьць і гэроізм на фоне паражэньня. Але ЯўТРАМ у сваёй пастаноўцы паказвае і выкрывае тыя памылкі, якія былі дапушчаны гэроямі і ахвярамі „Трыпольля“. Гэты момант у пастаноўцы апракідвае тое, што ЯўТРАМ узяў іменна „Трыпольскую трагэдыю“, а ня другі больш характэрны разьдзел грамадзянскае вайны. І гэта дасягнен не. Яшчэ большае дасягненьне „Фронтаў“ у тым, што памылкі „Трыпольля“ актуалізуюцца. Пастаноўка ЯўТРАМ'у выкарыстае гэтыя памылкі, каб мобілізаваць комсамольскую масу ў барацьбе за аўладаньне ваеннай тэхнікай і асабліва добра тое, што ў пастаноўцы гэта зьвязваецца з адпаведнымі рашэньнямі 9-га комсамольскага. „Фронты“ заклікаюць ажыцьцявіць рашэньні нашага апошняга зьезду ў галіне ліквідацыі ваеннай няпісьменнасьці, і—у будучым мы ўжо забясьпечаны ад паўтарэньня „трыпольскіх“ памылак.

„Фронты“ пераконваюць, што ў асобе „ЯўТРАМ'у мы маем энэргічны, здаровы, комсамольскі ТРАМ'аўскі колектыў, які здолен выконваць ролю мастацкага-агітпропу комсамолу. Гэта важнейшы вынік першай пастаноўкі. І гэта радасны вынік, вынік буйнага дасягненьня і вялікага палітычнага значэньня.

Як рэжысура, музыка, мастацкая конструкцыя, так і сам ТРАМ'аўскі колектыў паказа і максымальнае дасягненьне за такі кароткі час работы.

ЯўТРАМ гэта буйная падзея ў жыцьці і творчасьці беларускага комсамолу. Гэта і вялікае дасягненьне ў галіне нашага нацыянальна-культурнага будаўніцтва—нацыянальнага па форме і пролетарска-інтэрнацыянальнага па зьместу.

Сёньня ЯўТРАМ адчыніць заслону перад менскай рабочай моладзьдзю, перад менскім комсамолам. Мы будзем яго, наш ЯўТРАМ, сустракаць прывітаньнямі, любоўю і, іменна таму,—з крытыкай. Мы будзем драцца за яго прызнаньне. Мы будзем драцца за ўтварэньне для ТРАМ'у спрыяючых умоў работы.

К—т.

Чалавек з вялікадзяржаўнай „окружностью“

— Як намаляваць гэтую акружыну?—зьвярнулася студэнтка хэмікатэхнолёгічнага тэхнікуму Ярко да настаўніка т. Гольдштэйна.

— Что? — зьдзіўлена запытаў Гольдштэйн.

— Як намаляваць гэтую акружыну?—выразна паўтарыла студэнтка Ярко ў другі раз.

І яшчэ больш зьдзіўлена запытаўся Гольдштэйн.

— Какую „акружыну“?

— Вось гэтую, во!—паказвае пальцам студэнтка.

— Ведь это-же не акружына, а окружность!—раззлаваўся Гольдштэйн. І адразу пачаў кпіць са студэнтк:

— Ишь выдумала...

Прайшоў месячнік праверкі беларусізацыі, а арганізацыі і дырэкцыі Менскага хэміка-тэхнолёгічнага тэхнікуму засталіся ў баку ад гэтага месячніку.

Справа з беларусізацыяй абстаіць з рук вон дрэнна. Толькі студэнтаў гаворыць на расійскай мове. За ўсё паўгодзьдзе, г. зн. да вакацый, на першым курсе было праслухана толькі 6 лекцый беларускай мовы. А астатнія гадзіны для гэтай дысцыпліны сарваны.

Партыйная і комсамольская ячэйкі павінны ў тэрміновым парадку ўжыць рашучыя захады да тых, хто ігнаруе беларускую мову, дамагчыся сапраўднага пералому ў ажыцьцяўленьні нац.палітыкі партыі.

Мятла і В. К.

Спагнаць нядоімкі

СЛУЦАК. 7. Соракаўскі с-савет павінен рэалізаваць пазыку „5-ці годка ў чатыры гады“ на суму 5000 рубл. Рэалізаваны пазыка толькі на суму 1500 рубл., што складае 30 проц. Трактарных акцый неабходна было рэалізаваць на суму 1080 рубл., рэалізавана—200 рубл. што складае 18,9 проц.

Па сельсавету шмат нядоімак і прасрочак па збору сельгаспадатку самаабкладаньня, аднаразовага збору і г. д. Дасканальных сьпісаў нядоімшчыкаў у сельсавеце няма.

Ян Прыбытак і А. Ражко

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ ПАВІННА СТАЦЬ БАЯВОЙ ГАЗЭТАЙ САВЕТА[Ў] РЭКОНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫОДУ

Пастанова Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б па агляду ЦО „Пра[ў]ды“ аб газэтах „Сав Бел“ і „Прымежным Колгасьніку“

1) Сэкратарыят ЦК КП(б)Б цалком далучаецца да той ацэнкі газэты „Савецкая Беларусь“ і раённай газэты „Прымежны колгасьнік, якая дадзена ў аглядзе друку газэты „Праўда“ ад 24 сакавіка 1931 году.

2) Сэкратарыят ЦК КП(б)Б абавязвае рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь“ і рэдакцыю газэты „Прымежны колгасьнік“ зараз-жа перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць сапраўднае ператварэньне газэты „Савецкая Беларусь“ у баявую газэту саветаў рэконструкцыйнага пэрыоду і газэты „Прымежны колгасьнік“ у баявую раённую газэту, адпавядаючую патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да раёну, як асноўнага зьвяна соцыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

3) Сэкратарыят ЦК КП(б)Б зьвяртае ўвагу. як ў асаблівасьці рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“, так і ўсяго друку БССР, на неабходнасьць самага рашучага і пасьлядоўнага, самага шпаркага разгортваньня, „ня ўзіраючы на асобы“ пролетарскай самакрытыкі—аднэй з мацнейшых зброй партыі ў барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва.

4) Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь“ павінна забясьпечыць дзейнасьць тых матар'ялаў, якія зьмяшчаюцца на старонках газэты, ні ў якім разе не абмяжоўваючыся толькі рэгістрацыяй фактаў і не ператвараючы крытыку ў абязьлічаную і беспрадметную, неабходна „бальшавіцкай самакрытыкай дапамагчы сельсаветам. Але гэтага нельга рабіць, абыходзячы раённае зьвяно. Нельга абыходзіць і цэнтральныя організацыі“.

Сэкратарыят ЦК КП(б)Б ставіць на від рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“ за адзначаныя ў аглядзе „Пр[аўды]“ недапушчальныя шматлікія фа[кты] ператварэньня газэты ў перадатачн[ую] дыстанцыю па перасылцы доп[ісаў] рабселькораў, замест безадклад[нага] рэагаваньня на старонках газэты [,] няўменьне скарыстаць допісы, вы[кры]ваючыя праваопортуністычную п[ра]тыку, для палітычнага выхаван[ьня] мас, для скарыстаньня самакрыты[кі ў] барацьбе за генэральную лінію пар[тыі].

5) Прызнаць работу газэты „Са[вец]кая Беларусь“ і „Прымежны колг[ась]нік“ у галіне барацьбы за лён не[зада]вальняючай.

Абавязаць газэты „Савецкая Бе[ла]русь“ і „Прымежны колгасьнік“ і ў[весь] друк БССР концэнтраваць сыстэ[ма]тычную ўвагу на барацьбе за вы[ка]наньне загатовак і пашырэньне [па]сеўных плошчай лёну, што зьяўляе[цца] аднэй з асноўных і першачаргов[ых] задач.

6) Сэкратарыят ЦК КП(б)Б, у [да]датак да раней разасланы ра[ён]ным газэтам дырэктыў, яшчэ раз а[бa]вязвае кожную раённую газэту х[утка] чэй перабудаваць ўсю сваю работу [у] суадпаведнасьці з задачаю спэцыялі[за]цыі раёнаў.

7) Прызнаць ... заслухаць на сэк[ра]тарыяце ... КП(б)Б даклады рэд[ак]цый газэт „Савецкая Беларусь“, „Пр[ы]межны колгасьнік“ і Вушацкага ... КП(б)Б, а таксама садаклад Культпр[о]пу ЦК КП(б)Б аб выпраўленьні т[ых] недахопаў і памылак, якія былі адз[на]чаны ў аглядзе ЦО газэты „Праўд[а]“.

8) Даручыць Культпропу ЦК КП(б[)Б] разам з фракцыяй ЦВК БССР узма[c]ніць работнікамі газэту „Савецкая Б[е]ларусь“.

Газэту „Прымежны колгасьнік“ у[з]мацніць яшчэ адным работнікам.

Паведамленьні

10-га красавіка, а 7-й гадзіне ўвечары бюро колектыву ЛКСМБ Белдзяржбуду і бюро цэхавай ячэйкі будвучу організуюць у клюбе БІМ'у вечар, прысьвечаны 10-годзьдзю „Чырвонай Зьмены“ і ФЗВ.

Пасьля урачыстай часткі—мастацкая частка.

Будаўнік, прыходзь на вечар.

10 красавіка, а 7-й гадзіне ўвечары, у доме комсамолу адбудзецца нарада павадыроў і памочнікаў баз, павадыроў і памочнікаў атрадаў.

З прычыны важнасьці пытаньня яўка павадыроў і памочнікаў абавязкова без спазьненьня.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАС

ТАВАРЫШ!

Спэцыялізаваная брыгада „Чырвонай Зьмены“ у першых лічбах красавіка выпускае нумар газэты „Чырвоная Зьмена“ у Гомелі, у якім будзе асьвятляцца ўдзел комсамолу ў:

1. дапамозе прграднай гаспадарцы;
2. аўладаньні тэхнікай;
3. аўладаньні вайсковымі ведамі;
4. барацьба за якасныя і колькасныя паказчыкі прамфінпляну;
5. соцспаборніцтве і ўдарніцтве;
6. падрыхтоўцы комсамольскіх колектываў да 10-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“.

Памятай, ты павінен даць матар'ял у гэты нумар не пазьней 8-га красавіка і даслаць па адрасу:

Гор. Гомель, Гаркамолу, спэцыялізаван. брыгадзе „Чырвон. Зьмены“.

Гарком ЛКСМ спэцыялізаваная брыгада „Чырвонай Зьмены“.

Цэнтральнае праўленьне саюзу рабочых скурнікаў Беларусі з глыбокім жалем паведамляе аб бясчаснай сьмерці рабочага вылучэнца скурзаводу „Бальшавік“—дырэктара рымарнай фабрыкі „Васход“

ШЫФА

Вынас цела адбудзецца 9-IV—31 г., а 4-й гадз. дню з клюбу БІМ'у

Менгарком ЛКСМБ з жалем паведамляе аб несвачасовай сьмерці лепшага комсамольца, леніяца, былога сябра бюро ЦК ЛКСМБ, вылучэнца—дырэктара рымарнай фабрыкі

т. ШЫФА, які скончыўся 8 красавіка

МЕНГАРКОМ ЛКСМБ

Усім колектывам і ячэйкам г. Менску

Менгарком ЛКСМБ паведамляе, што вынас цела

т. ШЫФА

адбудзецца 9 красавіка а 4-й гадзіне дню

Збор каля дому комсамолу

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599